# Знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі

**80.** Прачытайце сказы. Назавіце ў іх аднародныя члены. Як звязаны аднародныя члены ў сказах?

1. Змоўклі, пахаваліся ў гнёздах птушкі. 2. Насустрач дзьмуў пругкі, **але** цёплы ветрык. 3. Пасля абеду сонца ўжо не грэла, **а** пякло. *(Я. Галубовіч.)*

Які знак прыпынку ставіцца паміж аднароднымі членамі сказа, звязанымі інтанацыяй пералічэння і злучнікамі ***а, але***?

Спішыце сказы.

Паміж аднароднымі членамі сказа ставіцца коска, калі яны звязаны паміж сабой
- інтанацыяй і злучнікамі ***а, але***:




- толькі інтанацыяй: 

**81.** Замяніце сказы кожнай групы адным сказам з аднароднымі членамі. Праверце, ці адпавядаюць сказы схемам.

1. За акном свішча вецер. За акном вые вецер.




2. Вучні ўважліва слухаюць аднакласнікаў. Вучні пільна слухаюць аднакласнікаў.



3. Надзя расказвае пра выкарыстанне сілы ветру. Паўлік расказвае пра выкарыстанне сілы ветру.

________, ________ ________ (*д. ч.*) (*д. ч.*) (*д. ч.*).

4. Настаўніца з задавальненнем назірае за вучнямі. Настаўніца з радасцю назірае за вучнямі.

________ (*д. ч.*), (*д. ч.*) ________ (*д. ч.*).

Запішыце сказы, якія атрымаліся. Пастаўце патрэбныя знакі прыпынку.







***Творчая хвілінка***

Раскажыце, як людзі навучыліся выкарыстоўваць сілу ветру. Пры неабходнасці запытайцеся ў бацькоў або знайдзіце патрэбныя звесткі ў інтэрнэце.

**82.** Прачытайце прыказку. Чаму так гавораць?

Рыбак рыбачыў а рыбы *(не)*бачыў.

Знайдзіце ў прыказцы галоўныя члены сказа. Назавіце аднародныя члены сказа.

Спішыце, раскрываючы дужкі. Пастаўце ў сказе патрэбны знак прыпынку.



Правообладатель Акадэмія адукацыі

**83.** Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся правільна яе вымаўляць.

Над возерам вецер лятае_ на хвалях лілеі люляе. *(М. Пазнякоў.)*

Назавіце ў сказе галоўныя члены. Вусна пастаўце пытанні да даданых членаў сказа. ?! Якія даданыя члены сказа паясняюць аднародныя выказнікі?

Які знак прыпынку прапушчаны ў сказе?

Запішыце скорагаворку па памяці.

**84.** Прачытайце. Хто названы вандроўнікам у загадцы? Чаму?



**Вандроўнік**

Ён за воблакі лятае_
дрэвы ўвосень распранае_
*(з/с)*кіне шапку з галавы_
*(з/с)*ліжа кропелькі з травы.
Самы хуткі ва ўсім свеце
ён, вандроўнік гэты — ... .

*Л. Багдановіч.*

Спішыце, раскрываючы дужкі. Дапішыце слова-адгадку. Падкрэсліце ў першым сказе галоўныя члены. Пастаўце патрэбныя знакі прыпынку на месцы пропускаў.

**85.** Прачытайце сказы. Знайдзіце ў іх аднародныя члены.

1. На канцэрце Алеся спявала, танцавала. На канцэрце Алеся спявала і танцавала.

2. Гледачы падарылі дзяўчынцы ружы, гваздзі́кі, рамонкі. Гледачы падарылі дзяўчынцы ружы, гваздзі́кі і рамонкі. Гледачы падарылі дзяўчынцы і ружы, і гваздзі́кі, і рамонкі.

Назавіце словы, якімі адрозніваюцца сказы кожнай групы. Звярніце ўвагу на знакі прыпынку ў сказах. **?!** Калі паміж аднароднымі членамі сказа не ставіцца коска?

Выпішыце сказы, у якіх аднародныя члены звязваюцца злучнікам ***і***.

Калі два аднародныя члены сказа звязаны злучнікам *і*, то коска паміж імі не ставіцца: ▭ *і* ▭.

Калі аднародныя члены сказа звязаны злучнікам *і*, які паўтараецца, то коска паміж імі ставіцца: *і* ▭, *і* ▭, *і* ▭.

**86.** Прачытайце прыказку. Чаму так гавораць?

Праца чалавека трымае
і ўзбагачае.

*і* ▭, *і* ▭;
▭ *і* ▭

Назавіце ў сказе аднародныя члены. Выберыце тую схему сувязі аднародных членаў, якая адпавядае сказу. Чаму паміж аднароднымі членамі няма коскі?

**87.** Прачытайце сказы. Знайдзіце ў іх аднародныя члены.

1. У нядзелю Сяро́жа быў у музеі у парку. У нядзелю Сяро́жа быў у музеі і ў парку. У нядзелю Сяро́жа быў і ў музеі і ў парку.



Правообладатель Акадэмія адукацыі

2. У вольны час мама і вяжа і вышывае. У вольны час мама вяжа вышывае. У вольны час мама вяжа і вышывае.

Назавіце сказы, у якіх паміж аднароднымі членамі трэба паставіць коску. Выпішыце тыя сказы, у якіх коска паміж аднароднымі членамі не ставіцца. Падкрэсліце злучнікі.

**88.** Прачытайце. Знайдзіце ў сказе галоўныя члены. Назавіце аднародныя члены сказа.



Коцік сплёў лазовы кошык_
прыхаваў за пасак ножык_
і адправіўся нібы
ў бор па шчырыя грыбы.

*Д. Бічэль.*

**па́сак** — рэмень, шнурок

Спішыце. Пастаўце, дзе трэба, коскі на месцы пропускаў.

**Рм** Назавіце вядомыя вам беларускія народныя казкі, героем якіх з'яўляецца кот. Якім паказаны кот у казках?

**89.** Прачытайце сказы. Знайдзіце ў іх аднародныя члены.

1. Панура і няўтульна выглядае лес позняй восенню. 2. І капялюшыкі і ножкі ў ранніх баравікоў маюць светлы колер. 3. Ад ветру затрымцелі і загудзелі верхавіны высокіх дрэў. 4. Алесь Паўлік і Міхась збіралі пад дубамі жалуды. 5. У паветры закружыліся вароны і галкі.

Спішыце. Пастаўце, дзе трэба, коскі паміж аднароднымі членамі сказа. Падкрэсліце злучнікі.

**90.** Разгледзьце на форзацы 1 схемы сувязі аднародных членаў сказа. З апорай на іх раскажыце правілы пастаноўкі знакаў прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі. Вусна складзіце сказ да кожнай схемы.

**91.** Прачытайце прыказку. Чаму так гавораць?

**Праца чалавека не паганіць, а корміць, поіць і вучыць.**

Назавіце ў сказе аднародныя члены. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку. Запішыце прыказку па памяці.

**92.** Прачытайце сказы. Вызначце сувязь слоў у іх па пытаннях.

Лісце шапаціць *пад нагамі*_ разносіцца *ветрам*. *(Я. Галубовіч.)*

Міхасёк *соладка* пазяхнуў_ і *адразу ж* прачнуўся. *(Я. Галубовіч.)*

Лёд патрэскваў_ але трымаў *хлопчыка*. *(В. Хомчанка.)*

Назавіце даданыя члены, якія паясняюць аднародныя члены сказа.

Спішыце. Пастаўце, дзе трэба, коскі на месцы пропускаў.

**Аднародныя члены сказа могуць мець пры сабе словы, якія паясняюць іх.**



Правообладатель Акадэмія адукацыі

**93.** Прачытайце верш. Які ён: сур'ёзны ці жартоўны?

### Булён

Прыйшоў *(М/м)*ірон
*(з/с)*варыў булён.
Прыйшоў *(П/п)*ятрусь
укінуў гусь.
Прыйшоў *(А/а)*лесь
і з*(ь/')*еў увесь.

*І. Курбека.*

Знайдзіце ў сказах верша аднародныя члены. Спішыце, раскрываючы дужкі. Пастаўце патрэбныя знакі прыпынку.

**94.** Дапоўніце сказы ў тэксце аднароднымі членамі. Выкарыстайце словы для даведкі.

Лістапад **абтрасае** з … і … лістоту. Стаяць … … дні. Неба **зрэдку** … пяшчотнай жаўцізной зары і тут жа … . *(Паводле Р. Ігнаценкі.)*

Словы для даведкі: *дрэў, кустоў; бязветраныя, ціхія; усміхнецца, патухне.*

Запішыце тэкст. Пастаўце патрэбныя знакі прыпынку паміж аднароднымі членамі.

У выдзеленых словах абазначце корань і прыстаўку. Растлумачце правапіс прыставак.

**95.** Спішыце. Пастаўце патрэбныя знакі прыпынку паміж аднароднымі членамі сказа.

1. Сем дзён губляе лісце клён і тчэ дыван вясёлы. *(Э. Агняцвет.)* 2. На прысады на кусты дожджык

сыплецца густы. *(Ю. Свірка.)* 3. Дзядуля Юзік коз гадуе аберагае іх шкадуе. *(В. Пунтус.)* 4. Пацягнуўся сыты коцік вымыў лапкі хвост жывоцік. *(Я. Жабко.)*

**прыса́ды** — дрэвы, пасаджаныя вакол дарогі, вуліцы, будынка

**96.** Прачытайце тэкст. Чаму ён мае такую назву?

## Памірыў галубоў

Дзьмуў халодны і марозны вецер. Андрэйка з цікавасцю назіраў за галубамі. Птушкі снавалі каля лаўкі, пералятaлі з месца на месца.

Два галубы не падзялілі скурку ад каўбасы. Яны распачалі бойку. Аднаму з іх надакучыла гэта валтузня. Голуб адляцеў ад лаўкі, сеў на клумбу. Пераможца зашчаміў у дзюбцы скурку, пакруціў галоўкай і паглядзеў на Андрэйку.

Андрэйка захацеў памірыць галубоў. Хлопчык дастаў з сумкі батон, адламаў ад яго акрайчык, падышоў да птушак.



Галубы паднялі галоўкі, насцярожыліся, але не спужаліся. Андрэйка пакрышыў батон на зямлю. Галубы з ахвотай пачалі дзяўбці духмяны пачастунак. Яны нешта завуркаталі на сваёй птушынай мове. Так галубы дзякавалі Андрэйку за пачастунак. *(Паводле І. Стадольніка.)*



Правообладатель Акадэмія адукацыі

Вызначце тып тэксту. Складзіце і запішыце яго план. Назавіце словы, якія дапамагаюць звязаць сказы ў тэксце.

Знайдзіце ў тэксце сказы з аднароднымі членамі. Выпішыце з іх аднародныя члены разам са словам, да якога яны адносяцца.

Узор. *Халодны і марозны вецер, ...*

**Рм** Вусна перакажыце тэкст па плане. Выкарыстайце запісаныя спалучэнні слоў.

**97.** Складзіце сказы па малюнках і апорных спалучэннях слоў. Запішыце. Правільна афарміце сказы на пісьме.



Толя і Коля,
кармушку



пілаваў дошкі
і майстраваў домік



старанна і акуратна
фарбаваў



вынеслі ў сад,
прымацавалі на дрэве

Назавіце ў сказах аднародныя члены. Падкрэсліце злучнікі, якія звязваюць іх.

❖ Раскажыце, з чаго можна зрабіць кармушкі. Чым можна частаваць птушак зімой? Пры неабходнасці запытайцеся ў бацькоў або знайдзіце патрэбныя звесткі ў інтэрнэце.

**98.** Прачытайце скорагаворку.

Падрыў крот крывы плот рые норку ў агарод. *(В. Вітка.)*

Спішыце. Правільна аформіце сказ на пісьме. Вусна вызначце сувязь слоў у ім па пытаннях. Падкрэсліце аднародныя члены сказа.

**99.** Прачытайце і адгадайце акразагадку. Запішыце слова-адгадку.

**З**вярок шукае ў лесе схоў
**ад** паляўнічых і ваўкоў.
**Я**го завуць «касы» здавён.
**Ці** здагадаліся, хто ён?

*У. Мазго.*

**акразага́дка** — вершаваная загадка, у якой пачатковыя літары кожнага радка, прачытаныя зверху ўніз, утвараюць слова-адгадку

Знайдзіце ў загадцы сказ з аднароднымі членамі. Чаму паміж аднароднымі членамі ў сказе не пастаўлена коска?

**100.** Прачытайце сказы. Знайдзіце ў іх аднародныя члены.

1. Іра паглядзела па баках а потым перайшла дарогу. 2. Чародка птушак праляцела над хмызняком



Правообладатель Акадэмія адукацыі

і апусцілася на поле. 3. На лясных сцежках сустракаюцца сляды зайцоў казуль лісіц. 4. Тата запаволіў крок але не спыніўся. 5. Дзед прайшоў луг абмінуў балотца і накіраваўся да рэчкі.

**хмызня́к** — кусты, зараснікі маладых дрэўцаў

Спішыце. Пастаўце, дзе трэба, коскі паміж аднароднымі членамі сказа. Падкрэсліце злучнікі.

**ле́дзьве**

**101.** У кожнай групе сказаў з аднароднымі членамі знайдзіце лішні. Выпішыце яго. Растлумачце свой выбар.

1. Выдаўся светлы і цёплы дзень. Стаіць позняя, але цёплая восень. Людзі радуюцца сонечнаму і цёпламу надвор'ю.

2. Гракі, вароны, галкі кружыліся над паркам. І жаваранкі, і кнігаўкі, і канаплянкі адляцелі ў вырай. Сінічкі, вераб'і, снегіры частаваліся зярняткамі.

3. І луг, і рэчка змяніліся восенню. Зімой сонца свеціць, але не грэе. У лесе, у полі пануе цішыня.

**102.** Прачытайце сказы. Перабудуйце іх у сказы з аднароднымі членамі. Для гэтага замест выдзеленых слоў выкарыстайце словы для даведкі.

**Дзеці** хадзілі па парку. Побач з дзецьмі **гуляў** маленькі сабачка. Ён ледзьве не дагнаў **быструю** вавёрку.

Словы для даведкі: *рухавую, жвавую; хлопчыкі і дзяўчынкі; бегаў, скакаў.*

Запішыце сказы, якія ў вас атрымаліся.

**103.** Прачытайце і адгадайце загадку.

Рагатыя мяшкі
прыдбалі кажушкі
гуляюць па лужку
і спяць у кажушку
*Р. Яўсееў.*



**прыдба́лі** — набылі́, займе́лі

Спішыце. Расстаўце патрэбныя знакі прыпынку ў сказе. Знайдзіце і падкрэсліце ў ім галоўныя члены.

**104.** Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся хутка і правільна яе вымаўляць.

**А**нтось атро**с** апошні аб**р**ыко**с** а пасля абрыкос **А**лёне аднё**с**. *(У. Мацвеенка.)*

Растлумачце правапіс выдзеленых літар у словах.

Назавіце ў сказе аднародныя члены. Якога знака прыпынку не хапае ў ім? Запішыце сказ па памяці. Правільна афарміце яго на пісьме.

**105.** Прачытайце. Вызначце межы сказаў. Запішыце тэкст, правільна афармляючы сказы на пісьме. Устаўце ў словы патрэбныя літары.

Ноч выдалася цёплая і ціхая ледзьве калыхаліся на ў..леску в..ршаліны сосен елак воз..ра было ўсыпана з..латымі зоркамі плыў і гойдаўся на хвалях срэбны р..жок месяца пад зорным небам сцішылася заснула вёска толькі недзе ля кузні гаўкаў сабака. *(Паводле Я. Галубовіча.)*



Правообладатель Акадэмія адукацыі

**106.** Прачытайце. Вызначце тып тэксту. Што апісваецца ў ім? Падбярыце загаловак да тэксту.

Першая пароша!.. Як жа яна да твару зямлі! Усё навокал набыло ўрачыстую прыгажосць і спакой. Стаяць апушаныя снегам дрэвы і хмызнякі. Мякка пахруствае пад нагой лёгкі, пульхны сняжок. *(Паводле Р. Ігнаценкі.)*

**паро́ша** — снег, які толькі што выпаў
**пу́льхны** — пушысты, мяккі, як пух

Знайдзіце ў тэксце сказы з аднароднымі членамі. Выпішыце іх. Падкрэсліце злучнікі.

**107.** Прачытайце. Растлумачце правапіс выдзеленых літар.

Між дубоў бяроз але**шы**н
навіхурыў снегу снежань.
*У. Дзюба.*

Назавіце ў сказе аднародныя члены. Якіх знакаў прыпынку не хапае ў ім? Запішыце сказ па памяці. Правільна афарміце яго на пісьме.

**Рм** **108.** Разгледзьце рэпрадукцыю карціны Станіслава Жукоўскага «Першы снег». Па якіх прыметах можна здагадацца, што мастак адлюстраваў надыход зімы? Якія фарбы пераважаюць на карціне? Які настрой яна стварае? Што адлюстравана ў цэнтры карціны? Што знаходзіцца на заднім плане?

З апорай на рэпрадукцыю карціны і план складзіце тэкст-апісанне.



План

1. Снег на зямлі і на дрэвах.
2. Заснежаныя мост і дамы́.
3. Халоднае люстэрка рэчкі.
4. Прыгажосць першага снегу.

Выкарыстайце наступныя спалучэнні слоў:

ноччу бушавала, насыпала снегу; раніцай сціхла, накрыў белым покрывам зямлю; лёгкім пухам лёг на дрэвы і кусты;

упрыгожыў белымі шапкамі; пабяліў мост;

яшчэ не замерзла, уецца цёмнай стужкай; між заснежаных берагоў; прыбраныя ў белыя футры дрэвы; урачыста ўглядаюцца;

як чараўнік; змяніў, упрыгожыў прыроду.

Запішыце тэкст, які ў вас атрымаўся. Назавіце ў ім сказы з аднароднымі членамі.



Правообладатель Акадэмія адукацыі

**109.** Прачытайце. Вызначце межы сказаў. Запішыце тэкст, правільна афармляючы сказы на пісьме. Устаўце ў словы патрэбныя літары.

Моцна скаваў мароз зямлю х..лодная кара лёду ле́гла на рэкі і азёры

падзьмуў вецер папа..злі па небе сн..гавыя хмары закружы..ся ў паветры белы пушок

прыціхла рэчка зусім закрыў яе снег луг поле горкі засыпа.. белы пух. *(Паводле Я. Коласа.)*

## ПРАВЕРЦЕ СЯБЕ

### *Адкажыце на пытанні*

1. Якія члены сказа называюцца аднароднымі?
2. Як яны могуць быць звязаны паміж сабой?
3. Калі паміж аднароднымі членамі сказа ставіцца коска?
4. Калі паміж аднароднымі членамі сказа не ставіцца коска?

### *Творчая хвілінка*

Уявіце, што ў класе праводзіцца канферэнцыя на тэму «Сказ». Падрыхтуйце паведамленне з прыкладамі на адну з прапанаваных тэм: «Як знайсці ў сказе аднародныя члены», «Навошта патрэбны знакі прыпынку». Карыстайцеся інфармацыяй на форзацах.

Прыдумайце пытанне, адказаць на якое можна, выкарыстаўшы сказ з аднароднымі членамі. Задайце сваё пытанне аднакласнікам.